# ГІСТОРЫЯ

УДК 94(476)«1921/1939»

*А. М. Вабішчэвіч*

## ПЛАНЫ ПОЛЬСКІХ УЛАД ПА НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ АСІМІЛЯЦЫІ НАСЕЛЬНІЦТВА ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСТВА (1921–1939 гг.)

*У артыкуле на падставе архіўных матэрыялаў, частка якіх упершыню ўведзена ў навуковы абарот, вывучаецца працэс выпрацоўкі польскімі ўладамі планаў паланізацыі беларускага насельніцтва Палескага ваяводства ў 1931–1939 гг. Характарызуюцца асаблівасці праектаў нацыянальна-культурнай асіміляцыі жыхароў заходнепалескага рэгіёна, іх вынiковасць. У ходзе аналізу аўтар высветліў узаемасувязь праблем нацыянальна-культурнай асіміляцыі Палесся з яго далейшай каланізацыяй. Паказана актывізацыя паланізатарскай дзейнасці ўрадавых колаў, ваяводскай і павятовай адміністрацыі з сярэдзіны 1930-х гг.*

### Уводзіны

Ужо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў заходнебеларуская праблематыка 1920–1930-х гг. з'яўляецца аб'ектам даследаванняў айчынных і замежных гісторыкаў. Пытанні сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, культурнага і рэлігійнага жыцця заходняй часткі Палесся разглядаліся пераважна ў кантэксце гісторыі Заходняй Беларусі. Толькі асобныя працы былі прысвечаны выключна праблемам Палесся [1]. Не складалі выключэнне і шматлікія даследаванні нацыянальнай палітыкі Польскай дзяржавы. Менавіта таму мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца аналіз асноўных праектаў палітыкі польскіх улад адносна беларускага насельніцтва Палесся. Для дасягнення гэтага былі пастаўлены наступныя задачы: высветліць змест, спецыфіку і выніковасць планаў урадавых колаў, мясцовай адміністрацыі ў адносінах да палескага рэгіёна, паказаць узаемазалежнасць праблем агульнага цывілізацыйнага развіцця Палесся і нацыянальна-культурнай асіміляцыі яго насельніцтва, вылучыць галоўныя фактары, якія ўплывалі на паспяховасць дзеянняў польскіх улад. Артыкул падрыхтаваны на падставе разнастайных архіўных крыніц, частка якіх упершыню ўведзена ў навуковы абарот.

### Вынікі даследавання і іх абмеркаванне

Паводле Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. у склад Польшчы разам з іншымі заходнебеларускімі землямі трапіла і заходняя частка Палесся. Беларускія этнічныя тэрыторыі палескага рэгіёна (Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі паветы) разам з населенымі ўкраінцамі Камень-Кашырскім і Сарненскім паветамі ўвайшлі ў Палескае ваяводства. Нягледзячы на сфальсіфікаваны характар вынікаў, перапіс насельніцтва 1921 г. засведчыў у Палескім ваяводстве большасць беларусаў – 42,6%, палякаў налічвалася 24,3%, украінцаў – 17,7%, яўрэяў – 10,4%, іншых – 5% [2, 12–14].

Хоць у пачатку 1920-х гг. польскія ўрады яшчэ не мелі распрацаванай праграмы нацыянальнай палітыкі на «ўсходніх крэсах» (заходнебеларускіх, заходнеўкраінскіх і ўсходнелітоўскіх землях), аднак у практычнай дзейнасці актыўна ажыццяўлялі палітыку іх інкарпарацыі, гвалтоўнай асіміляцыі насельніцтва. Аўтарам аднаго з рэгіянальных праектаў выступіў у лютым 1923 г. палескі ваявода С. Даўнаровіч [3, арк. 1–18]. Прапанаваныя ім мерапрыемствы (будаўніцтва дарог, аднаўленне жыллёвага фонду, гідрамеліярацыйныя работы, камасацыя зямель, урэгуляванне справы з сервітутамі, добраўпарадкаванне і рост гарадоў) патрабавалі значных капіталаўкладанняў, эканамічнай актыўнасці, аднак дазволілі б паскорыць працэс паланізацыі Палесся для пераўтварэння яго ў «новы галоўны ключ для панавання на ўсходзе». На думку С. Даўнаровіча, для дасягнення гэтай мэты неабходна было перагледзець адміністрацыйныя межы Палескага ваяводства, абараніць яго ад беларусізацыі з поўначы і ўкраінізацыі з поўдня, стварыць згуртаваную мясцовую адміністрацыю, якая «мае высокае ўсведамленне задач і надзелена значнай уладай», наладзіць супрацоўніцтва рымска-каталіцкай і праваслаўнай цэркваў з урадам «на карысць польскай дзяржаўнай ідэі», разгарнуць у Палескім

ваяводстве напружаную, мэтанакіраваную інвестыцыйную палітыку, аднавіць і пашырыць гарады, правесці іх паланізацыю, упарадкаваць гаспадарчыя адносіны мясцовага вясковага насельніцтва, ажыццявіць сістэматычную, планавую польскую каланізацыю» [3, арк. 5–6]. У бліжэйшай перспектыве Палессе павінна было стаць рэгіёнам дамінавання польскага ўплыву, буферам паміж беларускімі і ўкраінскімі землямі. Праект С. Даўнаровіча, які мадыфікаваўся наступнымі ваяводамі, да канца міжваеннага перыяду прызнаваўся самым аптымальным для вырашэння нацыянальных праблем у рэгіёне [4, 11]. Аднак да яго практычнай рэалізацыі справа не дайшла.

Таксама сфальсіфікаваны па свайму характару перапіс насельніцтва 1931 г. не высветліў выразнай тэндэнцыі паланізацыі ў Палескім ваяводстве. Па колькасных паказчыках (14,7%) [5, арк. 8] палякі з'яўляліся меншасцю. Адначасова больш за 707 тыс. чалавек зафіксаваны «тутэйшымі» (68,2% насельніцтва) [6, 42]. Іх разглядалі як нацыянальна несвядомых ці як тэрытарыяльна-дыялектную групу польскага этнасу. Нягледзячы на сваю нешматлікасць, палякі знаходзіліся ў прывілеяваным становішчы. Па стану на 15 лютага 1932 г. у Палескім ваяводстве з 8204 прадстаўнікоў інтэлігенцыі палякаў было 6196 (75,5%), яўрэяў – 799 (9,8%), рускіх – 787 (9,5%), украінцаў – 208 (2,5%), беларусаў – 214 (2,5%) [5, арк. 23]. Нацыянальны склад чыноўнікаў мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі і служачых органаў самакіравання выглядаў наступным чынам: з 5120 чалавек палякаў было 4508 (88%), рускіх – 294 (5,8%), беларусаў – 186 (3,6%), украінцаў – 67 (1,3%), яўрэяў – 65 (1,3%) [5, арк. 28].

У жніўні 1932 г. палескі ваявода Я. Крагельскі накіраваў у міністэрства ўнутраных спраў Польшчы асобны мемарандум па праблемах Палесся [5, арк. 1–39]. Паводле Я. Крагельскага, усяго актыўнага польскага элементу налічвалася толькі 4–5%. Існуючае рассяленне на Палессі нешматлікіх, распыленых, незаможных груп каланістаў (асаднікаў) не апраўдала спадзяванні польскіх улад. Такая сітуацыя ставіла на парадак дня праблему пашырэння польскай каланізацыі [5, арк. 8]. Новая хваля засялення Палесся польскімі асаднікамі звязвалася з правядзеннем яго меліярацыі. Для пашырэння каланізацыі патрабавалася падтрымка з боку дзяржавы, рацыянальнае размеркаванне ільготных крэдытаў і іншыя мерапрыемствы. Доля палякаў на працягу 10 гадоў павінна найперш узрасці за кошт «вельмі пасіўнага элементу» (г. зн. «тутэйшых») у ходзе яго паланізацыі.

Польскія ўлады не змаглі выканаць абвешчаную цывілізацыйную місію – забяспечыць радыкальныя зрухі ў эканамічным жыцці, сацыяльнай сферы, галіне культуры, адукацыі. У 1931 г. на Палессі непісьменныя складалі каля 35%. У гарадах гэты паказчык вагаўся ад 12,6% (Брэсцкі павет) да 30,4% (Столінскі павет). Самай высокай была непісьменнасць у палескіх вёсках – ад 40% да 68% [7, 32]. Тэмпы ліквідацыі непісьменнасці заставаліся павольнымі. У 1936 г. у Палескім ваяводстве 53 тыс. дзяцей школьнага ўзросту (23%) не былі ахоплены навучаннем [8, 98].

З сярэдзіны 1930-х гг. і на ўзроўні цэнтральнай улады ў Варшаве, і ў ваяводскіх структурах распрацоўваліся планы па паскарэнню каланізацыі «ўсходніх крэсаў», нацыянальна-культурнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва. Актыўна выкарыстоўваліся вынікі навуковых даследаванняў Л. Асоўскага, Ю. Тарнацкага, Ю. Абрэмбскага, С. Фагельсона, Л. Градзіцкага і іншых польскіх вучоных, прысвечаных розным пытанням мовазнаўства, этнаграфіі, дэмаграфіі Палесся. Палескай праблематыцы быў прысвечаны асобны І Справаздачна-навуковы з'езд (Варшава, 20–21 верасня 1936 г.), арганізаваны Камісіяй навуковых даследаванняў усходніх зямель.

У канцы 1936 г. уласны план адносна Палесся прапанавалі і вайсковыя колы (кіраўніцтва IX Корпуса аховы памежжа). Прадугледжвалася разгортванне будаўніцтва школ, кадравая чыстка сярод настаўнікаў, праваслаўнага і каталіцкага кліру Палескага, Навагрудскага ваяводстваў і інш. [9, арк. 4]. Для ажыццяўлення паланізацыі планавалася прыцягнуць усе існуючыя грамадскія і асветніцкія арганізацыі.

У лісце, накіраваным у лютым 1937 г. у МУС Польшчы, палескі ваявода В. Костэк-Бернацкі прапаноўваў на працягу бліжэйшых гадоў поўнасцю ліквідаваць «бясшкольныя акругі», прывесці існуючыя школьныя будынкі да неабходных патрабаванняў, палепшыць жыллёвыя ўмовы і забеспячэнне вясковых настаўнікаў, атрымаць дзяржаўны крэдыт на 5 гадоў на закупку драўніны для новых школьных будынкаў [10, арк. 14–19]. Ваявода выступаў таксама за паскарэнне меліярацыйных работ, пашырэнне камасацыі і інш. Больш чым 25 тыс. прадстаўнікоў засцянковай шляхты трэба было ўцягнуць у арбіту польскай культуры праз школы, армію, грамадскія арганізацыі [10, арк. 21].

На з'ездзе служачых сельскагаспадарчага апарату Палескага ваяводства 16 красавіка 1937 г. патрабавалася забараніць продаж зямлі праваслаўным, прадстаўнікам няпольскага насельніцтва

[11, арк. 303 адв.]. Чыноўнікам дзяржаўнай адміністрацыі, органаў самакіравання прадпісвалася выкарыстоўваць у адносінах з мясцовым насельніцтвам толькі польскую мову. Не дапускаліся казанні ў праваслаўных храмах на беларускай ці ўкраінскай мовах, а толькі па-польску. У выключных выпадках можна было выкарыстоўваць рускую мову ці мясцовыя дыялекты [11, арк. 304 адв.]. Была выказана непрымірымая пазіцыя адносна неауніі.

На пасяджэнні павятовых стараст, якое адбылося 25–26 студзеня 1938 г. у Брэсце, палескі ваявода В. Костэк-Бернацкі заявіў, што паланізацыя Палесся і праблема абароны краіны з'яўляюцца галоўнымі мэтамі ўнутранай палітыкі Польшчы. «Палессе павінна быць засвоена польскай культурай, а ўсё насельніцтва Палесся, да гэтага часу ў абсалютнай большасці нацыянальна несвядомае (за выключэннем яўрэяў), прызначана для польскасці, каб неўзабаве стаць польскім» [11, арк. 302 адв.]. 5 красавіка 1938 г. палескі ваявода разаслаў усім органам мясцовага кіравання сакрэтнае ўказанне аб прынцыпах правядзення імі нацыянальнай палітыкі адносна жыхароў Палесся: «Палешукоў, якія не прызнаюць сябе становуча ўкраінцамі, беларусамі ці рускімі, трэба прызнаваць палякамі, нягледзячы на веравызнанне і народную гаворку» [12, арк. 1].

Праблемы нацыянальна-культурнай асіміляцыі «ўсходніх крэсаў» (асабліва Палесся) урадавыя колы звязвалі з іх далейшай каланізацыяй. Па гушчыні заселенасці (31 чал. на 1 кв. км) Палессе мела ў другой палове 1930-х гг. самыя нізкія паказчыкі ў Польшчы, дзе на 1 кв. км прыходзілася ў сярэднім 83 чалавекі. Слабую заселенасць мелі Лунінецкі (19,1), Столінскі (23,3), Пінскі (27,1) паветы [7, 15–16]. Паводле аднаго з праектаў, пасля правядзення асушэння балот планавалася выдзеліць для 100 тыс. каланістаў з цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Польшчы 1,5 млн. га зямлі [13, арк. 10]. Найбольш эфектыўнымі сродкамі інтэграцыі лічыліся грамадскія работы, будаўніцтва дарог, асушэнне балот і іншыя мерапрыемствы ў галіне гаспадарчага жыцця. Так як гэтыя планы патрабавалі велізарных сродкаў, то меркавалася перасяліць ва ўсходнія землі звыш 200 тыс. пенсіянераў [13, арк. 25]. Аднак выканаць такія амбіцыйныя і адначасова авантурныя планы, распрацаваныя цэнтральнымі польскімі ведамствамі, не ўдалося. Аналіз такіх праектаў дае падставу не пагадзіцца з высновамі сучасных даследчыкаў пра тое, што ўрадавыя колы былі настроены на больш памяркоўныя формы паланізацыі, а мясцовыя ўлады схіляліся да больш радыкальных метадаў [14, 35].

У канцы 1930-х гг. Палессе працягвала захоўваць сваю этнаканфесійную адметнасць, што падштурхоўвала польскія ўлады да ўзмацнення паланізацыі. «Праваслаўная маса на Палессі ў палітычных і нацыянальных адносінах уяўляе сабой яшчэ не сфарміраваны элемент, прыдатны наогул да дзяржаўнай польскай асіміляцыі» [15, арк. 32]. У студзені 1939 г. у Палескім ваяводстве праваслаўныя складалі 77,76% жыхароў, католікі лацінскага абраду – 11,36%, католікі ўсходне-славянскага (візантыйскага) абраду – 0,24%, іудзеі – 9,33% [15, арк. 30]. Ваяводскія ўлады прызнавалі, што праваслаўнае насельніцтва падвяргаецца павольнай паланізацыі [7, 20]. Аднак планавалася паскорыць гэты працэс. Менавіта гэтае і іншыя пытанні канфесійнай палітыкі абмяркоўвалі на асобнай канферэнцыі ў Варшаве 14 лютага 1939 г., у якой удзельнічалі начальнікі грамадска-палітычных аддзелаў ваяводскіх упраўленняў усходніх ваяводстваў, чыноўнікі МУС, міністэрства веравызнанняў і грамадскай асветы, міністэрства вайсковых спраў [15, арк. 31–37].

Дэмаграфічныя працэсы на Палессі складваліся не на карысць польскай супольнасці. Нягледзячы на высокі ўзровень смяротнасці, Палессе мела ў канцы 1930-х гг. самы высокі не толькі ў межах Польшчы, але і Еўропы паказчык натуральнага прыросту – 19,2% у год. Пры гэтым лепшыя паказчыкі мела якраз беларускае насельніцтва (19,4%) у параўнанні з палякамі (17%) [7, 17–18]. У такіх абставінах ваяводскія ўлады лічылі, што «трэба пастаянна ўзмацняць працэс асіміляцыі і паланізацыі, бо іншым шляхам колькаснай перавагі польскага элементу на гэтай тэрыторыі не дасягнуць» [7, 18].

У падрыхтаванай ваяводскім упраўленнем у маі 1939 г. запісцы «Польскі стан валодання на Палессі» быў прапанаваны комплекс мер па ўзмацненню польскага ўплыву ў сацыяльна-эканамічным, нацыянальна-культурным і канфесійным жыцці [7, 81–110]. У сельскай гаспадарцы і аграрных адносінах прапаноўвалася паскорыць ліквідацыю цераспалосіцы, павялічыць капіталаўкладанні ў меліярацыю, захоўваць пазіцыі палякаў у землеўладанні і не дапускаць да яго прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва. Асаблівы акцэнт рабіўся на меры па нацыянальна-культурнай асіміляцыі насельніцтва: відазмяненне законаў 1924 г. для скасавання права аб магчымасці выкарыстання беларускай і ўкраінскай моў у адукацыі; закрыццё прыватнай рускай

гімназіі і пачатковай школы ў Брэсце; недапушчэнне дзейнасці ўкраінскіх, беларускіх, рускіх арганізацый на тэрыторыі ваяводства; выдаленне чыноўнікаў дзяржаўных органаў, настаўнікаў, служачых грамадскіх устаноў няпольскай прыналежнасці і замена іх выключна палякамі ці паланізаванымі палешукамі. Прадугледжвалася поўная паланізацыя праваслаўнай царквы [7, 82–83]. Сярод мер у канфесійным жыцці неабходна таксама адзначыць ліквідацыю неауніі, перадачу яе пляцовак рымска-каліцкай царкве; замену ў праваслаўных юліянскага календара на грыгарыянскі; утварэнне праваслаўнай семінарыі. Выказваліся прапановы па фінансавай падтрымцы будаўніцтва сеткі пачатковых школ, асабліва ў «бясшкольных акругах», адкрыццю новых ніжэйшых прафесійных школ, пашырэнню сеткі бібліятэк, народных дамоў і г. д. [7, 84]. Прапаноўвалася правесці каардынацыю і інтэграцыю ўсіх польскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў, уніфікацыю маладзёжных і жаночых арганізацый [7, 85]. Аднак пачатак Другой сусветнай вайны перашкодзіў рэалізацыі дадзенага праекта.

**Вывады**

Праведзены аналіз асноўных праектаў польскіх улад адносна беларускага насельніцтва Палесся пацвярджае высновы папярэдніх даследчыкаў аб тым, што нацыянальная палітыка Польшчы была накіравана на уніфікацыю гэтага рэгіёна з польскімі землямі, нацыянальна-культурную асіміляцыю насельніцтва, пераўтварэнне яго ў частку польскага этнасу. Пры гэтым удалося выявіць, што польская адміністрацыя імкнулася ўлічваць адметныя рысы эканамічнага, грамадскага, этнаканфесійнага жыцця дадзенага рэгіёна. У адрозненне ад іншых рэгіёнаў (напрыклад, Валыні) у Палескім ваяводстве не распрацоўваліся планы па падтрымцы аўтахтонных этнасаў, найперш беларусаў. Палешукі, якія не мелі ў пераважнай большасці сфарміраванай нацыянальнай свядомасці, разглядаліся як пераходны тып да польскага этнасу. Паводле канцэпцый польскіх улад, Палессе павінна было стаць бар'ерам для распаўсюджвання ўкраінскіх уплываў на поўнач. Планы нацыянальна-культурнай асіміляцыі палескага рэгіёна цесна звязваліся з яго каланізацыяй. Такім чынам, на выпрацоўку планаў паланізацыі Палесся ўплывалі не толькі асаблівасці этнаканфесійнага складу насельніцтва, але і востры характар аграрнага пытання, слабая ступень урбанізацыі, высокі ўзровень непісьменнасці, няразвітасць сацыяльнай інфраструктуры, дэмаграфічныя фактары і іншыя праблемы. Гэтыя землі, як і ўся Заходняя Беларусь, не мелі прагрэсіўнага сацыяльна-эканамічнага развіцця, заставаліся другараднымі і адсталымі ў межах Польскай дзяржавы. Менавіта гэта ў многім не дало магчымасці рэалізаваць у поўным аб'ёме планы нацыянальна-культурнай асіміляцыі насельніцтва Палесся.

*Літаратура*

1. Tomaszewski, J. Z dziejów Polesia 1921–1939: Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych / J. Tomaszewski. – Warszawa : PWN, 1963. – 208 s.
2. Rocznik statystyczny. – Warszawa : Glówny urząd statystyczny Rzeczypospolitej Polskiej, 1924. – 264 s.
3. Нарыс праграмы, заданняў і дзяржаўных работ на Палессі палескага ваяводы С. Даўнаровіча (1.03.1923 г.) // Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespół 9/1. – Sygnatura 938.
4. Сляшыньскі, В. Нацыянальная палітыка польскіх улад на землях Усходняй Літвы і Заходняй Беларусі / В. Сляшыньскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. – С. 9–15.
5. Мемарандум палескага ваяводы аб эканамічным, грамадска-палітычным, культурным, нацыянальным становішчы Палесся (1932 г.) // Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253.
6. Mironowicz, E. Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku / E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik. – Białystok : Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2005. – 171 s.
7. Polski stan posiadania na Polesiu. – Brześć nad Bugiem : B. w., 1939. – 110 s.
8. Вабішчэвіч, А. М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2004. – 116 с.
9. Прапановы ДОК-IX па пытаннях уздыму грамадска-палітычнага, эканамічнага жыцця і культурнага ўзроўню насельніцтва Палесся (18.12.1936 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 832.
10. Прапановы палескага ваяводы аб мерах па ўздыму адукацыйнага ўзроўню насельніцтва «ўсходніх крэсаў», рэлігіі, каланізацыі Палесся і па іншых пытаннях (1933–1938 гг.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1656.
11. Месячныя справаздачы палескага ваяводы аб дзейнасці польскіх і іншых легальных палітычных партый, грамадскіх арганізацый (студзень – снежань 1938 г.). Пратаколы нарад павятовых стараст Палескага ваяводства (25–26.01.1938 г.). Спісы польскіх палітычных партый і грамадскіх арганізацый // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1436.

12. Указанні палескага ваяводы органам самакіравання аб прынцыпах правядзення імі нацыянальнай палітыкі адносна жыхароў Палесся (1938 г.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1089.

13. Рэферат «Праблемы ўсходніх зямель у святле непасрэднага назірання за тэрыторыяй» (1935 г.) // AAN. – Zespół 9/1. – Sygnatura 946.

14. Загідулін, А. Нацыянальная палітыка ў адносінах да беларусаў у II Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / А. Загідулін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004. – № 10. – С. 31–38.

15. Справаздачы палескага і беластоцкага ваявод аб агульным рэлігійным настроі на тэрыторыі адзначаных ваяводстваў, уліковыя карткі і характарыстыкі палітычных поглядаў і маральнай устойлівасці праваслаўнага духавенства (1933–1939 гг.) // ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2305.

***Summary***

The author of the article analyzes how Poland government worked out the plans for polonysing belarusian people of the western part of Polesye in 1921–1939. The article views the peculiarities of the national policy of the Poland administration towards the local dwellers. The interrelations between the colonization of the western Polesye region and the projects of cultural assimilation are shown here.

*Паступіў у рэдакцыю 15.11.07.*

УДК 94(476)

*Д. С. Лавринович*

## ВИЛЕНСКИЕ КОНСТИТУЦИОННЫЕ ДЕМОКРАТЫ И ИХ СОЮЗНИКИ (1907–1915 гг.)

*В статье исследуется особенности идеологии и тактики виленских конституционных демократов, их взаимосвязи с центральными партийными органами и региональными политическими организациями, участие в выборах III–IV Государственных дум.*

*Автор показывает, что в межреволюционный период кадеты, как и другие партии, оказались в кризисном положении: падала численность партийных рядов, сокращалось количество местных организаций. На местном уровне конституционные демократы вынуждены были сотрудничать с национальными демократическими силами, стремясь создать общий фронт против царизма. Это привело к созданию масонских лож и к поддержке конституционными демократами белорусского национального движенния. В частноти, прочные связи установились между кадетами и братьями И. И. и А. И. Луцкевичами, газетой «Наша Ніва». В 1912 г. либералы совместно с белорусскими политиками начали издавать «Вечернюю газету». Кроме того, виленские конституционные демократы принимали активное участие в съездах, конференциях и совещаниях, устраивавшихся ЦК. На них они, как правило, оппонировали слева, добиваясь радикализации тактики Конституционно-демократической партии. Правительственные репрессии, углублявшийся раскол демократического лагеря по национальному признаку, а также выбытие виднейших деятелей существенно ослабили виленскую кадетскую организацию, прекратившую свое существование на второй год Первой мировой войны.*

### Введение

Конституционно-демократическая партия (КДП) играла значительную роль в общественно-политической жизни Российской империи начала XX в. Активно действовали кадеты и в Беларуси, однако в историографии им уделено мало внимания.

В монографии В. В. Шелохаева, специально исследовавшим историю кадетской партии, о кадетах в белорусских губерниях упоминается лишь эпизодично [1]. В связи с выборами и работой Государственной думы о КДП писал Н. М. Забавский [2]. Отдельные аспекты истории Конституционно-демократической партии в Беларуси затронуты в статье Н. С. Сташкевича [3]. Взаимодействие кадетов с польским национальным движением на белорусских землях показано в книге А. Ф. Смоленчука [4]. Некоторые аспекты национальной программы белорусских конституционных демократов освещены в статье П. А. Трубчика [5]. Имеется специальная статья о кадетах и в «Энцыклапедыі гісторыі Беларусі» [6]. Тем не менее, комплексного, всестороннего исследования деятельности Конституционно-демократической партии на территории белорусских губерний не существует.